Весці БДПУ. Серыя 2. 2022. № 4. С. 6–13

УДК 930(476)“1920/1970”

# ГІСТАРЫЯГРАФІЯ МАНАРХІЧНАГА РУХУ НА БЕЛАРУСКІХ ЗЕМЛЯХ У 1920 – ПАЧАТКУ 1970-х гг.

**П. А. Трубчык**,
*кандыдат гістарычных навук, дацэнт,*
*вучоны сакратар Інстытута гісторыі*
*Нацыянальнай акадэміі навук Беларусі*

UDC 930(476)“1920/1970”

# HISTORIOGRAPHY OF MONARCHIC MOVEMENT IN BELARUS IN 1920s – EARLY 1970s

**P. Trubchyk,**
*PhD in History, Associate Professor,*
*Academic Secretary of the Institute*
*of History, National Academy of Sciences*

Паступіў у рэдакцыю 05.05.22.

Received on 05.05.22

У артыкуле праводзіцца ўсебаковы аналіз гістарычных даследаванняў 1920 – пачатку 1970-х гг. партый манархічнага кірунку, якія дзейнічалі на тэрыторыі Беларусі ў пачатку XX ст., вызначаюцца заканамернасці і асаблівасці працэсу назапашвання гістарычных ведаў па праблеме. Зроблены высновы аб тым, што большасць прац прысвечана альбо дзейнасці саюзаў, альбо пагромнаму руху, прычым ні гісторыя манархічных арганізацый, ні ўся гісторыя масавых пагромаў 1881–1906 гг. не былі выкладзены: вывучаліся толькі асобныя іх аспекты. Разам з тым, у навуковы зварот была ўведзена значная колькасць дакументаў, пастаўлена праблема аб месцы партый манархічнага кірунку ў грамадска-палітычным жыцці на беларускіх землях у пачатку XX стагоддзя.

*Ключавыя словы:* Беларусь, Расійская імперыя, гістарыяграфія, манархічны рух, чарнасоценцы, савецкі перыяд.

The comprehensive analysis of historical studies of the 1920th – early 1970th of the monarchist parties that operated on the territory of Belarus in the early 20th century is carried out in this article, the regularities and features of the process of accumulation of historical knowledge on the problem are determined. Conclusions are drawn that most of the works are devoted either to the activities of unions or to the pogrom movement, and neither the history of monarchical organizations nor the entire history of the mass pogroms in 1881–1906 were set out: only their individual aspects were studied. At the same time a significant number of documents were introduced into scientific circulation, the problem of the place of monarchist parties in the political system of Belarus at the beginning of the 20th century was raised.

*Keywords:* Belarus, Russian Empire, historiography, monarchist movement, Black Hundreds, Soviet period.

*Уводзіны.* Гістарыяграфія манархічнага руху ў Расійскай імперыі пачатку XX ст. уключае ў сябе некалькі перыядаў, якія адрозніваюцца адзін ад аднаго метадалогіяй даследавання, колькасцю выкарыстаных крыніц, узроўнем тэарэтычных абагульненняў фактычнага матэрыялу. Пасля Кастрычніцкай рэвалюцыі дзейнасць праваманархічных арганізацый стала вывучацца савецкімі гісторыкамі і палітыкамі ў кантэксце праблем, звязаных з існаваннем царскага самадзяржаўя. На наш погляд, савецкі перыяд гістарыяграфіі манархічнага руху ўяўляецца мэтазгодным падзяліць на два этапы: 1) 1920 – пачатак 1970-х гг., пад час якога амаль усе даследаванні былі прадстаўлены літаратурай публіцыстычнага характару; 2) 1971–1991 гг., дзе публіцыстыка часткова саступае месца навуковым працам.

У дадзеным артыкуле ставіцца мэта праанализаваць найбольш вядомую савецкую літаратуру перыяду 1920 – пачатку 1970-х гг., у якой знайшлі адлюстраванне ацэнкі манархічнага руху ў Расіі і Беларусі ў пачатку мінулага стагоддзя.

*Асноўная частка.* Адна з першых спроб асвятлення манархічнага руху ў савецкай гістарыяграфіі звязана з заснавальнікам савецкай гістарычнай навукі акадэмікам Беларускай АН (1928), акадэмікам АН СССР (1929), М. М. Пакроўскім. У 1925 г. у зборніку «1905. История революционного движения в отдельных очерках», прысвечанага 20-годдзю пачатку Першай расійскай рэвалюцыі, ён надрукаваў нарыс «Мир и реакция». Відавочна, што аўтар адкрыта выконваў партыйны заказ, сутнасць якога зводзілася да стварэння ў асобе прыхільніка самадзяржаўнага ладу бяздумнага, непісьменнага, дэкласаванага элементу, які выкарыстоўваецца царскім урадам у якасці цёмнай сілы для барацьбы з рэвалюцыяй. Не турбуючы сябе вывучэннем гістарычных дакументаў, партыйны ідэолаг прыводзіць вытрымкі з бальшавіцкага часопіса «Пролетарий» ад 11 / 24 ліпеня 1905 г. аб сутыкненнях

рэвалюцыянераў з абаронцамі традыцыйных грамадскіх асноў у розных гарадах Расіі і на падставе гэтых прапагандысцкіх матэрыялаў робіць далёка ідучыя высновы. Правых ён, гэтак жа як і яго папярэднікі сацыял-дэмакраты, называе абразлівым словам «черносотенники». Іх сацыяльны склад абмяжоўвае прадстаўнікамі мясцовай адміністрацыі ў асобе чыноўнікаў, паліцыі і казакоў, мяшчан і працоўнага люду, пастаянна імкнучыся падкрэсліць прамую сувязь антырэвалюцыйных выступленняў правых з мэтанакіраванай антынароднай дзейнасцю ўлады і выкрыць апошніх у супрацоўніцтве з пагромшчыкамі. Праўда, М. М. Пакроўскі ўсё ж прызнае, што выступленні «чорнай сотні» сталі своеасаблівым адказам на рэвалюцыйныя акты, якія арганізоўваліся сацыял-дэмакратамі і іншымі левымі партыямі [1].

Да прац падобнага роду можна аднесці і невялікую брашуру І. Коган «Погромы в дни свободы (кастрычнік 1905 г.)», якая выйшла ў выдавецтве Усесаюзнага таварыства паліткатаржан і спецпасяленцаў у тым жа 1925 г. Звяртаючыся да падзей 1905–1906 гг., аўтар адзначае, што на пачатковым этапе рэвалюцыі пагромы былі накіраваны супраць яўрэяў і інтэлігенцыі, бо «интригами евреев и интеллигенции злонамеренно объяснялись все неурядицы внутренней жизни» [2, с. 5]. Далей робіцца заўвага аб тым, што восенню 1905 г. «полоса политических погромов достигает своей высшей точки: она уже не довольствуется одними инородцами, а захватывает всю революционную молодежь» [2, с. 5]. І тут жа даецца характарыстыка ўдзельнікаў вулічных пратэстаў, але толькі з боку абаронцаў самадзяржаўя, прычым у поўнай адпаведнасці з прапагандысцкімі штампамі ідэолагаў левырадыкальных сіл. «В погромах 1905 г. участвуют организующиеся повсюду “черные сотни”, в состав которых, – як лічыць аўтар, – входят агенты охранных отделений и множество чиновников других ведомств. На помощь себе при устройстве погромов они призывают всех подонков общества. Черные сотни, – адзначае І. Коган, – положили начало организации “Союза русского народа”, признанного скоро опорою престола Николая II. Самодержец всероссийский является верховным покровителем этой полуправительственной погромно-разбойничьей шайки...» [2, с. 5]. Затым размова ідзе аб прамых сувязях правых з уладнымі структурамі і абвінавачванні Саюза рускага народа (СРН) ва ўсіх сацыяльных узрушэннях і ахвярах рэвалюцыйнага ліхалецця. Дадзеная брашура сярод нешматлікіх, якія з’явіліся ў гэтыя гады, змяшчае кароткі матэрыял аб пагромах у Беластоку і Мінску, пры гэтым мінскі пагром названы адным «из наиболее жестоких». Гэта, на думку аўтара, выявілася ў тым, што ў разгоне несанкцыянаванага мітынгу з ужываннем зброі ўдзельнічалі рэгулярныя войскі. Варта адзначыць, што да арганізацыі сутыкненняў 18 кастрычніка 1905 г. у Мінску правыя партыі не мелі ніякага дачынення, на што паказвае і былы мінскі губернатар П. Курлоў у сваёй кнізе «Конец русского царизма», якая выйшла з друку ў 1923 г. [3, с. 35–37].

Значным укладам у гістарыяграфію манархічнага руху сярэдзіны 20-х гг. стала праца Л. Н. Вайталоўскага «Нарысы калектыўнай псіхалогіі», у якой утрымліваўся грунтоўны аналіз праблемы сацыяльнай псіхалогіі розных класаў і грамадскіх сіл ва ўмовах іх супрацьстаяння ў 1905–1907 гг. Аўтар прыходзіць да высновы, што «вся борьба общественных сил – по своему социально-психическому смыслу – сводится к оглушению эмоциональной отзывчивости и тем самым – к утверждению духовной апатии в рядах противника» [4, с. 74]. На рашэнне гэтай задачы, на яго думку, і быў накіраваны манархічны рух. Тут жа даецца своеасаблівая характарыстыка сацыяльнага складу Саюза рускага народа «Как известно, – піша аўтар, – эта погромно-монархическая организация состояла из элементов трех категорий, весьма различных по своему социальному положению. Наиболее “мирную” группу этого воинствующего союза составляли помещики-аристократы, предпочитавшие проводить свою классовую политику путем непосредственного давления на родственные им государственные сферы, по возможности не пользуясь рискованной помощью во Христе погромствующих “низов”. Что касается последних, т. е. низов, то они складывались из двух абсолютно враждебных категорий… К первой принадлежали кулаки, кабатчики, мелкие лавочники – злейшие ненавистники “крамолы”, так или иначе колеблющей священные основы “порядка”, т. е. собственности. Ко второй категории союзнической “черни” принадлежали “босяки”, золоторотцы, раклы, почетный и потомственный люмпен – все деклассированные элементы царских времен. Голодные отверженцы общества, пугачевцы и бунтари по натуре, всегда готовые грабить, насильничать и громить, они составляли самые боевые кадры “черной сотни”» [4, с. 75]. У кантэксце гэтых выказванняў можна адзначыць, што сацыял-дэмакрат Л. Н. Вайталоўскі свядома «не ўзгадвае» ўдарную сілу бальшавікоў у іх барацьбе за ўладу ў 1917–1920 гг.

Выклікаюць пэўную цікавасць высновы Л. Н. Вайталоўскага аб парадаксальных наступствах выніковай ахоўнай дзейнасці правых

саюзаў, пра тое, што «народная стихия», якая адбылася ў гады рэвалюцыі, стала практычна некантралюемай і пасля выканання сваёй прымірэнчай місіі, пазбавіўшыся падтрымкі з боку царскай улады, выступіла з рэзкай крытыкай урада, якая мала чым адрознівалася ад рэвалюцыйнай рыторыкі левых сіл. У якасці прыкладу ў нарысах прыводзяцца дзеянні рускага народнага Саюза імя Міхаіла Архангела (СМА), які выступіў «с обвинительным манифестом против всей высшей бюрократии, резко обличая последнюю в том, что она всячески поддерживает финансистов, спаивает народ водкой и доход от винной монополии тратит на уплату “жидам” процентов по внешним займам, игнорирует интересы крестьянства, не оказывает поддержки мелкому сельскому хозяйству и т. д. и т. п.» [4, с. 75–76].

Аб магчымай датычнасці правых партый да пагромаў у гады Першай расійскай рэвалюцыі маецца некаторы матэрыял у кнізе А. Д. Кіржніца «Рабоче-крестьянские массы в борьбе с погромами в 1905 г..» [5]. Яе аўтар у асноўным абмежаваўся ўласнымі каментарыямі апублікаваных у сацыял-дэмакратычным друку газетных артыкулаў, якія заклікалі да прадухілення нібыта падрыхтаваных урадам і паліцыяй пагромаў, накіраваных супраць рэвалюцыйных выступленняў і яўрэйскага насельніцтва. У працы ўтрымліваюцца дакументы, якія сведчаць аб арганізацыі бальшавікамі рэвалюцыйных баявых дружын, у задачу якіх уваходзіла ўзброенае супрацьдзеянне сваім палітычным праціўнікам у асобе прыхільнікаў самадзяржаўя. Аднак прыведзеныя ў кнізе факты не пацвярджаюць прамога ўдзелу ў падрыхтоўцы і арганізацыі пагромаў правых партый і саюзаў, тым больш што яны адбываліся ў большасці выпадкаў у кастрычніку 1905 г., а асноўныя палітычныя арганізацыі манархістаў пачалі ўтварацца ў канцы лістапада 1905 г. Наадварот, аўтар публікуе канкрэтныя звесткі аб актыўнай дзейнасці баявых дружын рэвалюцыянераў, у прыватнасці, у гарадах Паўночна-Заходняга краю – Вільні, Віцебску, Гомелі, Бабруйску, Дзвінску і Мінску. З гэтай нагоды А. Д. Кіржніц, які з’яўляўся ўраджэнцам Мінскай губерні (г. Бабруйск), піша: «... При двинском комитете РСДРП организовалась так называемая “боевая дружина”. Ее задачей было охранять митинги, манифестации от налетов полиции и казаков, бороться с черной сотней, покушавшейся не раз на устройство еврейских погромов. К декабрю 1905 г. боевая дружина насчитывала около 200 “боевиков”. Вот эта боевая дружина, вместе с дружинами других революционных организаций, и помешала двинской полиции устроить в городе еврейский погром... И в Вильне, Минске, Гомеле и Бобруйске также были организованы рабочие боевые дружины, которые в октябрьские дни оградили эти города и прилегающие к ним местечки от погромов. Такие отряды самообороны <...> были во всех городах Северо-Западного края, и благодаря им октябрьская погромная волна почти совершенно не задела этого густо населенного края» [5, с. 46–48].

Асобную групу даследаванняў гістарыяграфічнага характару ў адзначаны перыяд склалі працы Б. В. Цітлінава, Б. П. Кандзідава, Н. М. Растова, Р. Д. Кастамарава, Ф. К. Папова пра сувязі рускага праваслаўнага духавенства з манархічным рухам. Іх з’яўленне было выклікана, хутчэй за ўсё, «церковным террором». Разам з рэпрэсіямі ў дачыненні да святароў у 20–30-я гг. праводзілася актыўная антырэлігійная прапаганда, часткай якой стала хваля выкрывальных артыкулаў, брашур і кніг ваяўнічых атэістаў на адрас праваслаўнага духавенства, якое падтрымлівала ў Першай расійскай рэвалюцыі самадзяржаўны рэжым і прымала ўдзел у стварэнні і дзейнасці манархічных партый і саюзаў. У адпаведнасці з ідэалагічнымі ўстаноўкамі кіруючай бальшавіцкай партыі і духам таго часу іх аўтары імкнуліся пераканаць чытача ў рэакцыйнай сутнасці царквы ў гады рэвалюцыі і выкрыць яе служыцелей як ідэолагаў чарнасоценнага руху.

У адной з манаграфій Б. В. Цітлінава змяшчаны некаторы матэрыял аб кастрычніцкіх пагромах 1905 г. і звяртаецца ўвага на асобныя эпізоды ўдзелу праваслаўных святароў у дзейнасці Саюза рускага народа. Разглядаецца роля царквы ў правядзенні правымі партыямі выбарчых кампаній і праца яе прадстаўнікоў у Дзяржаўнай думе I–IV скліканняў. Акрамя таго, уяўляюць цікавасць разважанні аўтара пра ўплыў правых сіл на рэфарматарскую дзейнасць царкоўных іерархаў і іх процідзеянні ліберальным новаўвядзенням [6, с. 180–207]. Другая праца Б. В. Цітлінава, разам з паўторам некаторых палажэнняў першай, у большай ступені прысвечана тлумачэнню зместу пропаведзей і павучэнняў праваслаўнага духавенства вернікам і іх значэння для актывізацыі контррэвалюцыйных выступленняў правых сіл [7].

У 1930 г. у выдавецтве «Атеист» другім выданнем выйшла кніга Б. П. Кандзідава «Церковь в 1905 г.» (першае з’явілася ў сярэдзіне 20-х гг.). У спецыяльным раздзеле «Участие церкви в черносотенном движении и организации погромов» ён сцвярджае, што правыя саюзы ствараліся пры непасрэднай дапамозе духавенства, вышэйшыя іерархі якога затым і сталі іх кіраўнікамі. З гэтай нагоды аўтар піша:

«Летом 1905 года при помощи полиции и духовенства начинают организовываться черносотенные партии... Во многих губерниях церковники являлись главарями местных отделов этих банд... Многие из попов на черносотенной деятельности сделали себе карьеру, как, например, протоиерей Восторгов» [8, с. 89–90]. Калі адкінуць абразлівы стыль выкладання, то, па сутнасці, Б. П. Кандзідаў прыводзіць у большасці выпадкаў рэальныя факты (за выключэннем часу ўтварэння СРН і СМА – лета 1905 г., а на самай справе першы ўзнік у лістападзе 1905 г., другі канчаткова аформіўся ў сакавіку 1908 г.). Зусім па-іншаму ён апісвае сацыяльны склад манархічных арганізацый. «Эти партии (Союз русского народа, Союз Михаила Архангела и т. д.) выражали интересы помещиков, царских чиновников и попов. Помимо указанных, в ряды этих банд входили дворники, тайные и явные полицейские, так называемые “белоподкладочники” (из рядов барского студенчества), некоторые приказчики, всевозможные проходимцы и жулики» [8, с. 89]. Як відаць з прыведзенай цытаты, Б. П. Кандзідаў не змог пазбегнуць штампаў і ярлыкоў, якімі яшчэ з рэвалюцыйных часоў надзялялі манархістаў іх непасрэдныя палітычныя праціўнікі. Двума гадамі раней (1928 г.) была апублікавана яго брашура «Крестом и нагайкой», у якой асноўная ўвага надавалася гісторыі аддзела СРН, створанага архімандрытам Віталём у Пачаеўскай Лаўры, найбуйнейшым праваслаўным манастыры Галіцыі, у сямі кіламетрах ад аўстрыйскай мяжы, і які з’яўляўся, на думку аўтара, «организационной базой и опорным пунктом для черносотенного движения юго-западной Руси...» [9, с. 10–11].

У дадзенай працы таксама змешчаны матэрыял адносна царкоўна-чарнасоценной «философии», друкаванай прадукцыі манастырскага выдавецтва, арганізацыі і дзейнасці курсаў агітатараў пры аддзеле СРН, царкоўна-чарнасоценнага банка, кааперацыі і г. д. Аднак тут, як і ў пазнейшых працах Б. П. Кандзідава, адсутнічае навуковы аналіз прыведзеных фактаў і пераважаюць ўжо знаёмыя нам выкрывальныя матывы ў духу афіцыйнай ідэалогіі 20–70-х гг. мінулага стагоддзя.

Н. М. Растоў у манаграфіі «Духовенство и русская контрреволюция конца династии Романовых», у адрозненне ад сваіх калегпубліцыстаў, паспрабаваў больш грунтоўна разабрацца ў сацыяльным складзе палітычных партый, па яго меркаванні, наскрозь прасякнутых нянавісцю да рэвалюцыі «с ярко выраженным монархическим содержанием», якія маюць на мэце «точно определенные классовые цели» [10, с. 3]. Аднак і ён не змог пазбегнуць традыцыйных аднабаковых негатыўных ацэнак. Малюючы карціну першага публічнага мітынгу, арганізаванага 21 лістапада 1905 г. у Пецярбургу толькі што створаным Саюзам рускага народа, Н. М. Растоў піша: «Уже по этому первому публичному мероприятию “союзников” можно в точности представить себе их состав и дальнейшую деятельность. Это был прежде всего сброд всех деклассированных элементов общества, за деньги способных на любое преступление: затем шли прикосновенные к органам полицейской охраны: жандармы, дворники, шпионы, полицейские... В центре – руководящее ядро из незадачливых интеллигентов, сановников, бюрократов, помещиков, купцов и без конца духовных пастырей. Последние в “союзе русского народа” играли положительно доминирующую роль, особенно в провинции. Во многих городах “союз” бывал делом исключительно их рук» [10, с. 77]. Такім чынам аўтар робіць менавіта такі аналіз сацыяльнага складу манархічнага руху і месца ў ім прадстаўнікоў Рускай праваслаўнай царквы. Як бачым, тут няма ні слова аб удзеле ў СРН рабочых і сялян, што, як правіла, было ўласціва ўсім працам разглядаемага перыяду.

Да станоўчых бакоў манаграфіі можна аднесці выкладанне аўтарам гісторыі зараджэння і арганізацыйнага афармлення манархічнага руху, пачынаючы з Рускага сходу і да Саюза рускага народа ўключна. Пры гэтым Н. М. Растоў адным з першых сярод даследчыкаў дадзенай праблемы адзначае спецыфічныя рысы зноў утвараемых партый, справядліва ставячы на лідзіруючыя пазіцыі СРН [10, с. 51–56, 76–78]. Разам з тым, аўтар неаднаразова паўтарае даўно вядомы тэзіс аб непасрэдным удзеле СРН у арганізацыі пагромаў у 1905 г. [10, с. 68, 77–80]. У працы таксама разглядаюцца намаганні манархістаў да кансалідацыі сваіх сіл праз правядзенне аб’яднаўчых з’ездаў, удзел правых у выбарчых кампаніях і іх праца ў Дзяржаўнай думе, правядзенне маніфестацый, хросных хадоў і іншых мерапрыемстваў «верноподданнического характера» [10, с. 81–144]. Н. М. Растоў адным з першых узняў пытанне аб прычынах і сутнасці расколу Саюза рускага народа на тры фактычна самастойныя палітычныя партыі [10, с. 138–146].

Р. Д. Кастамараў ў невялікай брашуры «Черная сотня под флагом религии в 1905 году» прыводзіць шэраг дакументаў, у якіх адлюстравана абстаноўка ў Маскве і прылеглых ваколіцах у перыяд усеагульнай кастрычніцкай забастоўкі і да снежаньскага ўзброенага паўстання. Адносна ролі царквы ў гэты складаны і поўны драматызму час ён сцвярджае, што «церковь не только

была идейным вдохновителем разгрома революции... Она организовала отряды черной сотни, комитеты тайной самоохраны, под ее руководством избивались мирные демонстрации, громились рабочие кварталы, учинялась жестокая расправа над студентами и т. п.» [11, с. 3]. Думка пра тое, што менавіта царква, і асабліва праваслаўная канфесія, з’яўлялася арганізатарам і ідэйным натхніцелем контррэвалюцыі, праходзіць у Р. Д. Кастамарава праз усю кнігу. «Заручившись одобрением “монарха”, – піша ён далей, – митрополиты, епископы и попы двинулись в поход против революции и именем Христа благословляли казаков и черную сотню на разбой, грабеж и убийства, при которых не щадили ни взрослых, ни детей» [11, с. 6]. У такім жа кантэксце ў брашуры падаецца характарыстыка сацыяльнага складу манархічнага руху. Яе аўтар, відавочна выконваючы дзяржаўны заказ і не турбуючы сябе аб’ектыўным аналізам рэальных фактаў, заяўляў, што «попы ... организовали контрреволюционные силы... группировали под сенью Креста отряды черной сотни прочный союз “русских людей” из московских купцов, монахов, разного рода базарных торговцев и подонков преступного мира» [11, с. 16–17].

У кнізе «Попы-черносотенцы» Ф. К. Папоў разважае пра ролю царквы ў справе абароны самадзяржаўя і выказвае ў яе адрас абвінавачванні за сувязі з СРН [12, с. 25–38]. Прычыны пагромаў і іх удзельнікі характарызуюцца ў духу афіцыйнай, бальшавіцкай ідэалогіі без якога-небудзь аналізу, абагульненняў і высноў [12, с. 34–36].

Асаблівае месца ў гістарыяграфіі манархічнага руху 1920–1970-х гг. займае кніга У. М. Залежскага «Монархисты». Гэта была, амаль што, адзіная праца адзначанага перыяду, у якой аўтар паспрабаваў даць агульную карціну становішча, а затым і арганізацыі правых сіл у палітычныя партыі і саюзы. Аўтарам распрацавана схема генезісу і эвалюцыі чарнасоценнага руху, якой прытрымліваліся савецкія гісторыкі фактычна да пачатку 90-х гадоў. У раздзеле «Классовая природа политических партий» У. М. Залежскі адзначае, што менавіта нарастанне рэвалюцыйнага руху ў Расіі ў пачатку XX ст. актывізавала шэраг розных контррэвалюцыйных утварэнняў, і ў першую чаргу, дваранства і памешчыкаў, якія выступалі за захаванне царызму, служачага гарантам іх інтарэсаў, асаблівых правоў і прывілеяў. З такімі высновамі У. М. Залежскага нельга не пагадзіцца. Спасылаючыся на К. Маркса, аўтар падкрэслівае, «что революция сплачивает силы контрреволюции. Ярким подтверждением этих слов Маркса, – адзначае ён далей, – и являются те попытки сплочения дворянства в политическую организацию под видом правых и монархических партий, которые мы имеем перед революцией и во время революции 1905 года» [13, с. 10].

Своеасаблівая схема палітычнага самавызначэння правых сіл, прапанаваная У. М. Залежскім, дапаўняецца ў наступных раздзелах кнігі даволі падрабязным і грунтоўным аналізам гісторыі ўзнікнення і дзейнасці буйнейшых манархічных партый і саюзаў, пачынаючы з Рускага сходу і заканчваючы Саветам аб’яднанага дваранства [13, с. 11–32]. Да станоўчага боку адзначанай працы можна аднесці імкненне яе аўтара разабрацца ў тактыцы правых партый у рэвалюцыйных падзеях 1905–1906 гг., іх дзейнасці ў час існавання I і II Дзяржаўнай думы, а таксама ў пострэвалюцыйны перыяд рэакцыі і гады Першай сусветнай вайны. У гэтых раздзелах мы сустракаем хоць і нязначныя па змесце, але ўсё ж пазнавальныя матэрыялы, якія асвятляюць асобныя эпізоды, звязаныя з рэвалюцыяй і манархічным рухам на тэрыторыі тагачаснай Беларусі. У прыватнасці, аўтар узгадвае пра існаванне аддзела Рускага сходу ў г. Вільні, прыводзіць звесткі пра спробу «депутата от Гродненской губернии, земского начальника Ерогина организовать общежитие для депутатов крестьян, где бы их можно было обрабатывать в духе идей правых партий», дае некаторыя тлумачэнні па Беластоцкім пагроме 30 ліпеня 1905 г. і яўрэйскім пагроме ў Мінску (які адбыўся, хутчэй за ўсё, у студзені 1906 г.) [13, с. 12, 44–45, 50].

Кніга У. М. Залежскага носіць навукова-папулярны характар і прызначана для масавага чытача, што прывяло аўтара да пэўных спрашчэнняў у выкладанні рэальных фактаў і іх залішне вольнай інтэрпрэтацыі. Так, кастрычніцкія пагромы ён звязвае з Саюзам рускага народа, які, як вядома, быў створаны ў лістападзе 1905 г. і пачаў фарміраваць свае аддзелы і пададдзелы ў цэнтральных раёнах і на ўскраінах Расіі толькі ў 1906 г., тэндэцыйна падаецца і сацыяльны склад гэтай партыі. «В это время, – сцвярджае У. М. Залежскі, – возникает Дубровинский “Союз русского народа”, который наряду с погромно-настроенной мелкой буржуазией организует и втягивает в свои ряды упомянутые уже выше подонки общества – босяков, хулиганов, сутенеров, лиц темных профессий и прямой уголовный элемент. К середине октября вся российская черносотенная организация “низов” в основном была закончена и предоставила себя в распоряжение правительства» [13, с. 45].

У тым жа 1929 г. быў апублікаваны зборнік дакументаў аб Саюзе рускага народа па матэрыялах надзвычайнай следчай камісіі Часовага ўрада з вялікім уступным артыкулам У. П. Віктарава, у якім аўтар шмат у чым паўтарае схему ўзнікнення правых арганізацый, прапанаваную У. М. Залежскім у разгледжанай вышэй працы. У. П. Віктараў справядліва заўважыў, што менавіта «рост рабочего движения, начало крестьянского движения, втягивание в революцию интеллигенции... ставили перед правительством и господствующим классом задачу организации какой-то “народной” партии, которая бы выступила в защиту самодержавия... Именно в этот период на помощь правительству выходит Союз русского народа» [14, с. 3]. У артыкуле аналізуецца ідэалогія манархічных арганізацый-папярэднікаў СРН, іх стратэгія і тактыка, разглядаюцца найважнейшыя праграмныя патрабаванні. Асаблівую ўвагу аўтар надаў сацыяльнаму аспекту праграмы Саюза рускага народа і прыйшоў да высновы, што яго “социальная программа сводилась к общей формуле – поднятие народного благосостояния” [14, с. 6]. Услед за гэтым У. П. Віктараў паспрабаваў выкрыць СРН у палітычным папулізме. «Укрепить в низах идею возможности разрешения социальных и экономических противоречий, идею поднятия благосостояния при помощи самодержавия, – адзначае ён, – эту цель и поставил Союз русского народа. Идея разрешения социальных противоречий при помощи самодержавия обеспечивала безусловно Союзу русского народа известный контингент членов из мелко-буржуазных низов, не изживших еще веры в царя, как “отца” народа, заботящегося о своих подданных» [14, с. 7].

У. П. Віктараў адным з першых закрануў прычыны расколу СРН, паказаў сутнасць існуючых рознагалоссяў, выявіў каналы фінансавых паступленняў у партыйныя касы правых, даў грунтоўную характарыстыку сацыяльнай базы манархічнага руху ў цэлым, вызначыў геаграфію распаўсюджвання манархічных арганізацый, адзначыўшы «значительную роль Союза русского народа в западных окраинных областях» [14, с. 7–15].

Грунтоўным даследаваннем для гэтага перыяду, у якім знайшлі адлюстраванне падзеі, звязаныя з дзейнасцю манархічных арганізацый, стала кніга Е. Д. Чарменскага «Буржуазия и царизм в революции 1905–1907 гг.», якая выйшла першым выданнем у 1939 г. У ёй аўтар закрануў тэму пагромаў, удзелу ў іх чорных сотняў, а таксама сацыяльны склад контррэвалюцыйных сіл. «Царские власти, – як сцвярджае аўтар, – в целях раздробления борьбы масс вербуют банды из подонков населения, которые под предводительством реакционных помещиков, духовенства и полиции устраивают массовые избиения революционеров и еврейского населения. Невиданная свистопляска погромов, разгул карательных экспедиций, массовые бессудные казни и бесчинства полиции, войск и черной сотни ярко демонстрировали перед лицом народа, чего стоят царские обещания свобод» [15, с. 146–147]. Як вынікае з прыведзенай цытаты, нічога новага ў параўнанні з папярэднімі савецкімі даследчыкамі гісторыі манархічнага руху Е. Д. Чарменскі прапанаваць, на жаль, не змог. Больш таго, у кнізе ўтрымліваюцца ўскосныя сведчанні вінаватасці ў пагромах рэвалюцыйных партый, у тым ліку і бальшавікоў.

З канца 1930-х і да мяжы 1960–70-х гг. мінулага стагоддзя сур’ёзнае навуковае вывучэнне гісторыі манархічных партый і іх рэгіянальных арганізацый практычна адсутнічае. Асобныя працы, прысвечаныя расійскім рэвалюцыям, у якіх у той ці іншай меры згадваліся манархісты, паўтараюць старыя, канчаткова ўсталяваныя ў афіцыйнай гістарыяграфіі штампы.

Некаторым выключэннем з агульнага правіла можна лічыць зборнік артыкулаў «Революция 1905–1907 гг. в национальных районах России», які выйшаў другім, дапоўненым і перапрацаваным выданнем у 1955 г. Аўтары артыкула «Революция 1905–1907 гг. в Белоруссии» А. І. Воранава і Я. П. Лук’янаў узгадваюць пра чорныя сотні без рэзкай крытыкі, хоць і яны ўсю віну за арганізацыю пагромаў ускладвалі першапачаткова на паліцыю і чорную сотню [16]. Аднак яны прызналі і факты актыўнага ўдзелу ў гэтых сацыяльных канфліктах саміх рабочых.

Пэўныя зрухі ў распрацоўцы тэмы намеціліся пасля XX з’езда КПСС, калі змянілася палітыка-ідэалагічная сітуацыя ў краіне, у выніку чаго былі створаны больш-менш спрыяльныя ўмовы для працы гісторыкаў. Павышэнне інтарэсу ў гэтыя гады да праблемы саюзнікаў і праціўнікаў пралетарыяту на першым этапе рэвалюцыі прывяло даследчыкаў да думкі аб неабходнасці займацца вывучэннем гісторыі непралетарскіх партый, у тым ліку чарнасоценных арганізацый. Адной з першых работ гэтага кірунку стала кандыдацкая дысертацыя І. Д. Вайсберга [17]. Аднак адыходу ад ранейшых стэрэатыпаў, на жаль, не адбылося.

У пачатку 1960-х гг. была апублікавана манаграфія С. М. Сідзельнікава, дзе ўпершыню ў савецкай гістарыяграфіі была пастаўлена праблема эвалюцыі канцэпцыі палітычных партый, у тым ліку і праваманархічных у дачыненні да Дзяржаўнай думы [18]. І хоць аўтар не аналізаваў праграмных дакументаў чарнасоценцаў, тым не менш, з’яўленне манаграфіі стала сведчаннем запатрабаванасці пастаўленай праблемы.

Грунтоўнай працай для гэтага перыяду, у якой рабілася спроба аб'ектыўнага вывучэння гісторыі правых манархічных партый у Расійскай імперыі, стаў курс лекцый (у двух частках) аб непралетарскіх партыях У. В. Коміна (выдадзены ў 1970 г.) [19]. Партыям манархічнага кірунку быў адведзены асобны раздзел. Асноўнай крыніцай для яго падрыхтоўкі паслужыў зборнік дакументаў «Саюз рускага народа», выдадзены па матэрыялах надзвычайнай следчай камісіі Часовага ўрада ў 1917 г. Аўтар ахарактарызаваў толькі Саюз рускага народа (даецца інфармацыя аб баявых дружынах, дзейнасці, адносінах унутры Саюза і інш.), аб Рускім сходзе і Саюзе рускіх людзей толькі адзначаецца, што яны былі папярэднікамі СРН, а аб Рускай манархічнай партыі ўвогуле не ўзгадваецца. У цэлым, у працы паўтараліся закладзеныя раней у дачыненні да правых партый стэрэатыпы. Між тым, гэта была першая абагульняючая праца пасля перапынку ў сорак гадоў, што, несумненна, прывяло да росту цікавасці да гісторыі манархічных партый.

*Заключэнне.* Такім чынам, відавочна, што гістарычная літаратура гэтага перыяду несла адбітак свайго часу і характарызавалася, перш за ўсё, адсутнасцю альтэрнатыўных напрамкаў у вывучэнні праблемы. Гістарычныя з'явы разглядаліся на падставе прынцыпу партыйна-класавага падыходу. Артыкулы і брашуры насілі, перш за ўсё, ідэалагічны характар і ставілі мэтай выкрыццё палітычнага праціўніка. Толькі ў працы В. Н. Залежскага зроблена спроба даць агульную карціну эвалюцыі манархічнага руху. Разам з тым, савецкая гістарыяграфія адзначанага перыяду зрабіла важны крок у распрацоўцы дадзенай праблемы. Пашырэнне колькасці даступных крыніц у гэты перыяд стварыла перадумовы для больш глыбокіх высноў і абагульнення гісторыі чарнасоценства. У навуковы зварот была ўведзена значная колькасць дакументаў, пастаўлена праблема аб месцы партый манархічнага кірунку ў грамадска-палітычным жыцці на беларускіх землях у пачатку XX стагоддзя.

*Літаратура*


1. *Покровский, М. Н.* Мир и реакция / М. Н. Покровский // 1905. История революционного движения в отдельных очерках / Комиссия ЦИК СССР по организации празднования 20-летия революции 1905 г. и Истпарт ЦК РКП (б) ; под ред. М. Н. Покровского. – М. ; Л., 1925. – Т. 2. – С. 225–263.
2. *Коган, И.* Погромы в дни свободы (октябрь 1905 г.) / И. Коган. – М. : Изд-во Всесоюз. о-ва политкаторжан и ссыльнопоселенцев, 1925. – 15, [1] с.
3. *Курлов, П.* Конец русского царизма. Воспоминания бывшего командира корпуса жандармов / П. Курлов ; с предисл. М. Павловича. – М. ; Пг. : Гос. изд-во, 1923. – 296 с.
4. *Войтоловский, Л. Н.* Очерки коллективной психологии. Часть II. Психология общественных движений / Л. Н. Войтоловский. – М. ; Петроград : Гос. изд-во, 1925. – 118 с.
5. *Киржниц, А. Д.* Рабоче-крестьянские массы в борьбе с погромами в 1905 г. / А. Д. Киржниц. – М. : Изд-во Всесоюз. о-ва политкаторжан и ссыльнопоселенцев, 1930. – 123 с.
6. *Титлинов, Б. В.* Православие на службе самодержавия в русском государстве / Б. В. Титлинов. – Л. : Гос. издат., 1924. – 210 с.
7. *Титлинов, Б. В.* Церковь во время революции / Б. В. Титлинов. – Пг. : Былое, 1924. – 192, [4] с.
8. *Кандидов, Б. П.* Церковь в 1905 г. (очерки и материалы) / Б. П. Кандидов. – 2-е изд., доп. – М. : Атеист, 1930. – 200 с.
9. *Кандидов, Б. П.* Крестом и нагайкой (Почаевская Лавра и черносотенное движение) / Б. П. Кандидов. – М. : Акц. издательское общество. «Безбожник». – 1928. – 233 с.
10. *Ростов, Н.* Духовенство и русская контрреволюция конца династии Романовых / Н. Ростов. – М. : Атеист, 1930. – 156 с.
11. *Костомаров, Г. Д.* Черная сотня под флагом религии в 1905 году / Г. Д. Костомаров. – М. : Безбожник, 1931. – 46 с.
12. *Попов, Ф. К.* Попы-черносотенцы / Ф. К. Попов. – М. – Иваново-Вознесенск, 1932. – 76 с.
13. *Залежский, В. Н.* Монархисты / В. Н. Залежский. – Харьков : Пролетарий, 1929. – 77 с.
14. Союз русского народа. По материалам Чрезвычайной следственной комиссии Временного правительства 1917 г. / сост. А. Черновский ; ред. и вступ. статья В. П. Викторова. – М. ; Ленинград : Государственное издательство, 1929. – 444 с.


*References*


1. *Pokrovskij, M. N.* Mir i reakciya / M. N. Pokrovskij // 1905. Istoriya revolyucionnogo dvizheniya v otdel'nyh ocherkah / Komissiya CIK SSSR po organizacii prazdnovaniya 20-letiya revolyucii 1905 g. i Istpart CK RKP (b) ; pod red. M. N. Pokrovskogo. – M. ; L., 1925. – T. 2. – S. 225–263.
2. *Kogan, I.* Pogromy v dni svobody (oktyabr' 1905 g.) / I. Kogan. – M. : Izd-vo Vsesoyuz. o-va politkatorzhan i ssyl'noposelencev, 1925. – 15, [1] s.
3. *Kurlov, P.* Konec russkogo carizma. Vospominaniya byvshego komandira korpusa zhandarmov / P. Kurlov ; s predisl. M. Pavlovicha. – M. ; Pg. : Gos. izd-vo, 1923. – 296 s.
4. *Vojtolovskij, L. N.* Ocherki kollektivnoj psihologii. Chast' II. Psihologiya obshchestvennyh dvizhenij / L. N. Vojtolovskij. – M. ; Petrograd : Gos. izd-vo, 1925. – 118 s.
5. *Kirzhnic, A. D.* Raboche-krest'yanskie massy v bor'be s pogromami v 1905 g. / A. D. Kirzhnic. – M. : Izd-vo Vsesoyuz. o-va politkatorzhan i ssyl'noposelencev, 1930. – 123 s.
6. *Titlinov, B. V.* Pravoslavie na sluzhbe samoderzhaviya v russkom gosudarstve / B. V. Titlinov. – L. : Gos. izdat., 1924. – 210 s.
7. *Titlinov, B. V.* Cerkov' vo vremya revolyucii / B. V. Titlinov. – Pg. : Byloe, 1924. – 192, [4] s.
8. *Kandidov, B. P.* Cerkov' v 1905 g. (ocherki i materialy) / B. P. Kandidov. – 2-e izd., dop. – M. : Ateist, 1930. – 200 s.
9. *Kandidov, B. P.* Krestom i nagajkoj (Pochaevskaya Lavra i chernosotennoe dvizhenie) / B. P. Kandidov. – M. : Akc. izdatel'skoe obshchestvo. «Bezbozhnik». – 1928. – 233 s.
10. *Rostov, N.* Duhovenstvo i russkaya kontrrevolyuciya konca dinastii Romanovyh / N. Rostov. – M. : Ateist, 1930. – 156 s.
11. *Kostomarov, G. D.* Chernaya sotnya pod flagom religii v 1905 godu / G. D. Kostomarov. – M. : Bezbozhnik, 1931. – 46 s.
12. *Popov, F. K.* Popy-chernosotency / F. K. Popov. – M. – Ivanovo-Voznesensk, 1932. – 76 s.
13. *Zalezhskij, V. N.* Monarhisty / V. N. Zalezhskij. – Har'kov : Proletarij, 1929. – 77 s.
14. Soyuz russkogo naroda. Po materialam Chrezvychajnoj sledstvennoj komissii Vremennogo pravitel'stva 1917 g. / sost. A. Chernovskij ; red. i vstup. stat'ya V. P. Viktorova. – M. ; Leningrad : Gosudarstvennoe izdatel'stvo, 1929. – 444 s.

15. *Черменский, Е. Д.* Буржуазия и царизм в революции 1905–1907 гг. / Е. Д. Черменский ; под ред. В. А. Быстрянского. – М. ; Л., 1939.
16. *Воронова, А. И.* Революция 1905–1907 гг. в Белоруссии / А. И. Воронова, Е. П. Лукьянов // Революция 1905–1907 гг. в национальных районах России : сб. ст. / под ред. Л. М. Иванова [и др.]. – 2-е изд., перераб. и доп. – М. : Госполитиздат, 1955. – С. 144–211.
17. *Вайсберг, И. Д.* Совет объединенного дворянства и его влияние на политику самодержавия (1906–1914 гг.) : автореф. дис. … канд. ист. наук / И. Д. Вайсберг . – М., 1956. – 18 с.
18. *Сидельников, С. М.* Образование и деятельность первой Государственной думы / С. М. Сидельников. – М. : Издательство Московского университета, 1962. – 382 с.
19. *Комин, В. В.* История помещичьих, буржуазных и мелкобуржуазных политических партий в России : факультативный курс лекций : в 2 ч. / В. В. Комин. – Калинин : Калинин. гос. пед. ин-т, 1970. – Ч. 1 : 1900 – июнь 1917 гг. – 277 с. ; Ч. 2 : 1917–1923 гг. – 179 с.

15. Chermenskij, E. D. Burzhuaziya i carizm v revolyucii 1905–1907 gg. / E. D. Chermenskij ; pod red. V. A. Bystryanskogo. – M. ; L., 1939.
16. *Voronova, A. I.* Revolyuciya 1905–1907 gg. v Belorussii / A. I. Voronova, E. P. Luk'yanov // Revolyuciya 1905–1907 gg. v nacional'nyh rajonah Rossii : sb. st. / pod red. L. M. Ivanova [i dr.]. – 2-e izd., pererab. i dop. – M. : Gospolitizdat, 1955. – S. 144–211.
17. *Vajsberg, I. D.* Sovet ob»edinennogo dvoryanstva i ego vliyanie na politiku samoderzhaviya (1906–1914 gg.) : avtoref. dis. … kand. ist. nauk / I. D. Vajsberg . – M., 1956. – 18 s.
18. *Sidel'nikov, S. M.* Obrazovanie i deyatel'nost' pervoj Gosudarstvennoj dumy / S. M. Sidel'nikov. – M. : Izdatel'stvo Moskovskogo universiteta, 1962. – 382 s.
19. *Komin, V. V.* Istoriya pomeshchich'ih, burzhuaznyh i melkoburzhuaznyh politicheskih partij v Rossii : fakul'tativnyj kurs lekcij : v 2 ch. / V. V. Komin. – Kalinin : Kalinin. gos. ped. in-t, 1970. – Ch. 1 : 1900 – iyun' 1917 gg. – 277 s. ; Ch. 2 : 1917–1923 gg. – 179 s.